# 17 верасня наша краіна святкуе Дзень народнага адзінства




Гэтае свята прымеркаванае да адной з найважнейшых падзей беларускай гісторыі — уз'яднання ў 1939 годзе Заходняй Беларусі і БССР. Зацверджаны яшчэ ў 1939 годзе як "дзень вызвалення працоўных Заходняй Беларусі ад польскіх паноў", апошні раз на агульнасаюзным узроўні ён быў адсвяткаваны ў 1949 годзе. На першае месца выйшлі меркаванні палітычнай мэтазгоднасці - тэрытарыяльныя пытанні не павінны былі азмрочваць дружалюбныя адносіны паміж СССР і Польшчай ўнутры адзінага сацыялістычнага блока. Указам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 7 чэрвеня 2021 года № 206 у нашай краіне заснавана дзяржаўнае свята - Дзень народнага адзінства, які адзначаецца штогод, 17 верасня.